ХУДОЖЕСТВЕННЫЙ ТЕКСТ КАК ПОЛЕ АКТУАЛИЗАЦИИ СВОЙСТВ РОДНОГО ЯЗЫКА И МЕЖКУЛЬТУРНОГО ВЗАИМОДЕЙСТВИЯ

В. Ю. Бароўка
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава
e-mail: klit@vsu.by

УДК 821.161.3-1:811.161.3'42

Мастацкае асэнсаванне мовы ў паэзіі Рыгора Барадуліна

Ключавыя словы: паэзія, мова, родная мова, мастацкае асэнсаванне, тэматыка.

Творы Р. Барадуліна – яркі ўзор як латэнтнага, так і прамога асэнсавання мовы. Аналіз метамоўных рэфлексій у паэзіі Барадуліна дазваляе сцвярджаць, што літаратура – гэта не толькі мастацтва слова, але і важны сродак мастацкага асэнсавання мовы ў жыцці чалавека, гісторыі роднай мовы і яе ўзаемадзеяння з мовамі народаў-суседзяў, сувязі пісьменніка з роднай зямлёй, уплыву мовы на ўспрыманне чалавекам свету. Адмысловай рысай асэнсавання мовы Р. Барадуліным з'яўляецца шырокае выкарыстанне асацыятыўнага плана, гумару, перыфраз, арыгінальных параўнанняў і метафар.

Літаратура – мастацтва слова, без моўнай асновы праблематычна ўявіць яе існаванне. Пісьменнік нават незалежна ад сваёй волі вымушаны рэфлексаваць над матэрыялам, з якім працуе, бо перад ім стаіць задача для паспяховай рэалізацыі мастацкай задумы абраць максімальна прыдатныя моўныя сродкі. Многія аўтары спецыяльна прысвячалі творы асвятленню ролі мовы ў жыцці звычайнага чалавека і творцы, звярталіся да разважанняў пра ролю роднай мовы. Адзін з такіх аўтараў у беларускай літаратуры – Рыгор Барадулін. Яго з поўным правам можна назваць мастацкім даследчыкам беларускай мовы і ролі мовы ў жыцці чалавека. Яго мысленне было прасякнута арыгінальнымі моўнымі асацыяцыямі. У вершы "Кнігары" ён шматзначна заўважыў: "Усе мы літары / Зямлі – Зялёнай кнігі"[1, 38]. Прыродныя з'явы ў свядомасці паэта нярэдка нараджалі паралелі з моўнымі з'явамі. Так, у вершы "Папрасіліся ліўні ў верш" выкарыстана надзвычай паказальная для паэта асацыяцыя: "Працуе таропка / тэлеграф навальнічны: / працяжнік – кропка. / Маланка! / Клічнік!" [1, 360]. Гукі першага снегу паэтам па прынцыпе асацыяцыі параўноўваюцца са збегам шыпячых. Дарэчы, аўтар пры гэтым ўмела выкарыстоўвае ў вершаваных радках алітарацыю свісцячых і шыпячых гукаў з мэтай гукапераймання: "Нібы шыпячых зычных збег, / Спакойны, сыпкі / З самай раніцы / Спадаў на сцежкі / Ціхі снег" [1, 328]. Ва ўступе да паэмы "Трыпціх" з дасціпным пераасэнсаваннем формы сінтаксічных знакаў тлумачылася значэнне паняцця "бацькоўская зямля": "Ад кропкі маленькай гнязда чмяля / Да маладзіковай коскі – / Падорана ўсё мне бацькамі, / Зямля / Таму і завецца бацькоўскай"[1, 137]. Праз гумарыстычнае абыгрыванне значэнняў слоў, што называюць часціны мовы, паэт, напрыклад, гаварыў пра свой шаноўны ўзрост: "А я, пасівелы дзядоўнік, / Стаю пры апошняй вярсце. / Яшчэ на зямлі я назоўнік, / А мне ўжо займеннік расце" [2, 359]. Каламбур, дзе замест літаратурнага "заменнік" ужываецца дыялектнае "займеннік" узмацняе гумарыстычны план верша. Віртуознае валоданне словам пастаянна нараджала ў Барадуліна

вершы, дзе жартаўліва пераасэнсоўвалася гучанне і значэнне слоў, як у “Дарожнай граматыцы”: “Запамінае восень слова / Kalt / Далёка йшчэ да белых падзяжоў. / Надледзянелы з раніцы асфальт / Прабіты пасашкамі капяжоў. / Абцас дакладны / Тут ступаў няраз, / Брук, як свайго, дапытваў: / – Was ist das ? / Калі са шпорай бот / Ляцеў на фэст, / Пыталіся прысады: / Co to jest ? / І каблучок, / Пацокваючы смела, / Вяз у асфальце спёкаю: / – В чём дело? / Гамаш з падэшваю / Працёрта-мяккаю / Ашчэраны / Адно спрагае: / – Дзякую!” [2, 259–260]. Паасобныя словы нярэдка служылі аўтару сродкам стварэння пэўнай сюжэтнай сітуацыі. Так, у вершы “Урок англійскай мовы” слова “yes” у вуснах студэнтачкі, што хоча падабацца маладым людзям, параўноўваецца са свістам сінічкі. Лірычны герой верша папярэджвае, што неўзабаве ласкавыя адносіны дзяўчыны могуць кардынальна змяніцца на сваю процілегласць: “Потым расшалопаеш, / Воз сямейны цягнучы, / Іншы выгук: / “No” [1, 385].

Паводле Р. Барадуліна, чалавек жыве, пакуль гаворыць. Гэта ідэя ляжыць у аснове надзвычай арыгінальнага па форме верша “На схіле алфавіта”, які пачынаўся словам “Адчай” і заканчваўся парадаксальным падсумаваннем: “І кожнае слова / Твой век пялегвае, / Пакуль у слоў цябе / Не выйграе пры дзяльбе / Ці- / шы- / ня” [2, 83]. Паэзія Рыгора Барадуліна – тонкае мастацкае даследаванне мовы, яе ролі для грамадства, для культуры, для творчасці, для асобы. З поўным правам Барадуліна можна назваць натхнёным песняром роднай мовы. Паэзія трымаецца на бездакорным валоданні творцам мовай і яго шчырасці і шчодрасці, як сцвярджае Р. Барадулін у вершы “Закон паэзіі”: “Ні зычным горлам, ні плачом, / Ні пафасам цвёрдагаловым, / Ні трубным рыкам, ні плачом, / Ні капытамі, ні лычом – / Нічым не возьмеш. / З чытачом / Патрэбна быць гатовым / Дзяліцца нашча словам” [1, 47]. Мова, як даводзіць паэт у вершы-прысвячэнні “Андрэю Вазнясенскаму”, падначальвае сабе нават таленавітага аўтара. Дарэчы, знакамітага рускага паэта другой паловы XX стагоддзя ён атэстуе наступным чынам: “Антыскептык Андрэй, / Рускай мовы вялікі прыгонны!” [1, 310].

Мова ёсць, бясспрэчна, важны сродак зносін паміж асобнымі людзьмі і народамі. Адмысловая роля ў чалавечым грамадстве перакладчыкаў прыцягвала ўвагу Р. Барадуліна. Вядомаму перакладчыку твораў беларускіх аўтараў на рускую мову Якаву Хелемскаму ён прысвяціў верш “Перакладчыкі”, дзе выказаў свае меркаванне пра працу тых, хто збліжае літаратуры і народы: “Перакладчыкі – / Шпалаўкладчыкі / На адказнай чыгунцы дружбы. / Не падрадчыкі, / А дарадчыкі, / Звонкамоўных зямель упарадчыкі, / Не пыхліўцы, / Што прагнуць: / «Руж бы!»” [10, 307]. Праца перакладчыка, у разуменні Р. Барадуліна, – складаная і адказная: “Парадкоўнікі – / Не паратоўнікі. / Не даруе абразы слова. / Слоўнікі – / Як-ніяк / Чыноўнікі. / Называюць сябе назоўнікі / Дзейсная ў дзеяслова / Выснова” [1, 307]. Сапраўдныя перакладчыкі, як метафарычна шляхам ужывання сэнсава змястоўных перыфраз заўважае паэт, – сапраўдныя майстры сваёй справы: “Зорнамоўнага неба / Капернікі, / Недаверлівай музы / Сапернікі / Шанавальнікі арыгінала” [1, 307].

У вершы “Неруш” Р. Барадулін артыкуляваў ролю мовы як асновы творчасці, як аснову арыгінальнасці нацыянальнай літаратуры і канкрэтнага аўтара: “Неруш ранішні – роднае слова, / Мне шукаць цябе, покуль гляджу, / Пад зялёным крылом верасовак, / Пад крысом спякоты й дажджу. / Слова, што як нарог для ратая, / Як для ластаўкі – стромы вільчак, / Ад якога на небе світае, / Ад якога яснее ў вачах. / А пашчасціць – натрапіцца неруш, – / Зазвіняць недзе промні наўзбоч. / Неруш свой панясу я аберуч, / Як слязіну з матуліных воч. / Ад абразы, ад позірку злога, / Шлях заблытаўшы для наслання” [3, 101]. Радкам верша “Неруш ранішні – матчына слова, / Мне, як бору, цябе засланяць” [3, 101], як сведчыць яго мастацкая спадчына, паэт захоўваў вернасць ўсё жыццё.

Метафарычна функцыі роднай мовы асвятляліся ў вершы-прысвячэнні “Роднаму слову”: “Было спрадвеку, слова, ты / Крыніцай цудадзейнай сілы, / Што вызваляла з нематы, / Айчыны ніву каласіла. / Ты наталяла смяглы рот / І васкрашала ўдар грамовы, / Каб сам сабою стаў народ, / Пачуўшы гукі крэўнай мовы!” [3, 277].

Р. Барадулін пастаянна артыкуляваў нацыятворны пачатак мовы, якая развіваецца пад уплывам абставін і часу, якая мае самае прамое дачыненне да жыцця канкрэтнага народа. Велічальнай песняй роднай мове з’яўляецца яго верш “Беларускае слова”: “Беларускае слова ад спеву / Бо спявае ў ім даўніна. / Беларускае слова ад гневу, / Ад Ярылы, ад Перуна. / Беларускае слова ад ласкі – / Сведчаць вусны ды салаўі, – / Не наймалася ні ў падпаскі, / Ні ў падбрэхічы, ні ў халуі. / Беларускае слова ад злосці / Да няпрошаных прыбышоў, / Асалоду п’е з чараў мілосці, / Медавуху духу з каўшоў. / Беларускае слова ад славы, / Ад ракі дае светлае дно. / Госці ўстануць з застольнай лавы, / Як у хату зойдзе яно. / Беларускае слова ад Бога, / Слову нашаму Бог дапамог. / Хто не любіць яго, ад тога / Назаўсёды адвернецца Бог!” [2, 248]. Для паэта родная мова – важны этнаідэнтыфікацыйны код: “Ты ад маці, ты матчына, / Беларуская мова. / Зорамі растлумачана / Сэрцу кожнае слова. / Ты, як раніца шчырая, / Маеш цёплыя рукі. / І вяртаюцца выраі – / Толькі б чуць твае гукі. / Там, дзе ёсць ты, – пагодліва, / Дзе няма – там зімова. / Будзь ты ўдзячных паходняю, / Беларуская мова” [2, 286].

Шэраг вершаў Барадулін прысвяціў асэнсаванню ролі мовы ў жыцці асобнага чалавека і гістарычнаму лёсу беларускай мовы. Родная мова, у трактоўцы паэта, – натуральнае атачэнне ад нараджэння да смерці. Лірычны герой паэта зазначае: “Долі інакшай не трэба зямной, / Сэрца лагоднее ад суцяшэння: / Родная мова ступала за мной / Ад калыханкі / Да галашэння” [1, 351]. Твор “Мая мова” – разважанне пра родную мову з акцэнтаванай дэманстрацыяй уласнай пазіцыі: “Сцвярджаюць гісторыкі і мовазнаўцы, / Што паступова сціраюцца грані нацый / І, нібыта як перажытак, аджыць павінна абавязкова / Мова маці маёй – беларуская мова, / Што мне, як імя ўласнае, блізкая і знаёмая, / Што па жылах маіх цячэ і сонным Сажом і Нёманам” [3, 103]. Лірычны герой верша разумее, што народы па меры развіцця цывілізацыі збліжаюцца, што гэты працэс няўхільны: “Я чакаю часіну сябрыны людской, / Але не згаджуся, што родныя мовы луской / Былі на рыбіне чалавецтва, / Якая ў вечнасць плыве акіянам вечнасці. / І калі нават мова мая замаўчыць, / То не зробіцца мёртвай латынню. / Словы, дзе кожны гук / Азяблай сініцай цінькае, / Не стануць тэрмінамі медыцынскімі. / Калі мова мая / Уліецца ў агульны акіян – / Пацячэ ў ім, стрыманая, / Цёплым Гальфстрымам / І будзе мне сэрца грэць / Кожным ашчаджаным словам, / Бо, як жыта, спрадвечная, Беларуская мова!” [3, 103].

Сувязь мовы і жыцця, далейшы лёс лексічнага складу роднай мовы таксама прыцягвалі увагу паэта. Творча, метафарычна, экспрэсіўна гэтыя пытанні знайшлі ўвасабленне ў вершы “Забытыя хутары”: “Забытыя хутары – / Этымалагічныя слоўнікі, / Паз’ехалі гаспадары, / А словы дасюль не злоўленыя, / Выжыўшы ў ліхалеццях, / Гнездзяцца ў пунях, у клецях / Ластаўкамі легкакрылымі / Ў кожным праломе, выламе. / Стрынуць цішыню стрыжамі / Над стрэхамі, над крыжамі. / Сняжэюць словы і росяцца, / І ў сэрцы пагрэцца просяцца” [2, 23]. У гумарыстычным па танальнасці вершы “Прызнанне” паэт зазначаў: “Як уплывовы дзядзька / Сваякоў, / Я словы перацягваю / Ушацкія / У стольны Мінск / Па лініі радкоў. / Няхай жа мне / Сімпатыі сваяцкія / Даруюць чытачы. / Сваю радню, / Як дабрыню, / Я ўпарта перацягваю, / Падперазаўшыся / Зямляцкай дзягаю, / Былы давер / Ад сцюжы бараню. / І, каўняры наставіўшы, / Са мной / Ідуць упоплеч / Словы наравістыя. / І ўшацкі край, / Што ў непагадзі выстаяў, / Як шчыт надзейна-родны за спіной” [2, 31–32]. З маленства чутае роднае слова пісьменніку хацелася захаваць для нашчадкаў.

Месца беларускай мовы ў коле моў свету па-мастацкутонка, метафарычна, экспрэсіўна, сэнсава ёміста выказана ў “Нашай мове”: “Думку нашчыш золкімі ўспамінамі, / Сэрца песняй жніўнаю надзеіш, / У вякоў пад цёмнымі ялінамі / Белаю бярэзінкай ніцеіш” [2, 70]. Параўнанне “белаю бярэзінай ніцеіш” эстэтычна і аксіялагічна важкае ў пісьменніцкай трактоўцы роднай мовы: беларуская мова не належыць да вялікіх моў, па колькасці яе носьбітаў яна нешматлікая, але яна захоўваецца на працягу стагоддзяў.

Таленавіты паэт з Ушаччыны з добрым веданнем справы пісаў і пра ўзаемадзеянне моў і культур на беларускай зямлі. “Мове роднай маёй карані вымывалі / Славяншчыны рэкі” [1, 309], – канстатаваў Р. Барадулін у вершы “Андрэю Вазнясенскаму” і зазначаў, што кожная мова мае здольнасць да аднаўлення: “Праступаюць вякі / Праз хлуд: / Чысціня нашых моў, / Як фрэскі” [1, 309]. У вершы “Беларускія татары” ён выказаў словы глыбокай ўдзячнасці татарам, што карысталіся мовай суседзяў у сваіх кнігах: “Вы мову збераглі крывіцкую / І ў сэрцах вашых, / І ў кітабах” [2, 367] і адзначыў: “Хапіла ж нашым мовам / Смеласці, / Сышоўшыся, не разгубіцца, / А ў маладой паразумеласці, / Як дзвюм крыніцам, / Светла біцца” [2, 368]. У трактоўцы паэта, мовы народаў-суседзяў узаемадзейнічаюць, збліжаюць людзей, а паэты жывуць, пакуль жыве іх мова, паводле радкоў верша “Апошнія паэты яўрэйскія”: “Каму чытаць ім / вершы свае на ідыш? / Старыя пайшлі да продкаў, / аглухлі, / адвыклі. / Моладзь не разумее. / Сабакі ў гарадках перадохлі. / Местачковыя вераб’і / ў апошнім калене / звяліся хіміяй. / Ні школ, ні вучняў, / Толькі словы / такія-сякія ўпалі / па дарозе / ў беларускую мову. / Мне цьмяна прыгадваецца, / наплыўна бачыцца, / як на перадваенны брук / ляцелі з вокан / кніжкі з незразумелымі літарамі, / нібыта па снезе / прайшлося шмат лапак птушыных. / Зачынялася школа / у мэтах адзінамоўя / альбо ўзаемаразумення. / Хоць дагэтуль / столькі вякоў / Янка і Янкель, Зося і Залда / добра адно аднаго разумелі” [2, 139–141]. Паэта непакоіла знікненне з карты свету народаў і моў як наступства неразумнай дзейнасці людзей: “У кнізе скону / Удоды і совы, / У кнізе Чырвонай / Народы і мовы. / Яна разбухае, / Яна чырванее / За нашу нахабнасць, / За нашыя дзеі” [1, 136].

Істотныя лініі метамоўных рэфлексій у Рыгора Барадуліна – мова і пісьменнік, пісьменнік як захавальнік і абаронца мовы. У прысвечаным ураджэнцу Віцебшчыны грамадскаму дзеячу і паэту XIX стагоддзя, за ўдзел у паўстанні 1863 года сасланаму ў Сібір, Арцёму Вярыгу-Дарэўскаму вершы “У выгнанні” трагедыя сасланага аўтара бачылася Барадуліну найперш у адарванасці таго ад роднай глебы, што пазбавіла яго творчасць крылаў натхнення: “І для каго пісаць, / Калі не чуеш мовы, / Калі прыціхла ўсё ў спуджаным бары? / І совы мудрых слоў / Вартуюць сховы, / Маўчаць табе ў спіну / У сквапным гушчары” [2, 20]. Трапна характарызаваў Р. Барадулін стыль і ўнёсак выдатных пісьменнікаў-землякоў у развіццё мовы. Так, у вершы “За словам Быкава іду!” ён надзвычай дакладна заўважаў пра манеру пісьма знакамітага пісьменніка: “Ашчадны быкаўскі радок, / Як непрытомлены хадок, / Вядзе на топішча, / На ляды, / На Посніцу, Дзяды, Каляды. / І рада, ўчуўшы халадок, / Душа сабе не даўшы рады” [2, 152–153], а ў вершы “Успамін пра Уладзіміра Караткевіча” падкрэсліваў патрыятызм і адданасць роднай культуры: “Ты верны рыцар / Слоў крывіцкіх, гойных / Якія не загубяцца нідзе” [2, 208].

Аналіз метамоўных рэфлексій у паэзіі Р. Барадуліна дазваляе сцвярджаць, што літаратура – гэта не толькі мастацтва слова, але і важны сродак мастацкага асэнсавання мовы ў жыцці чалавека, гісторыі роднай мовы і яе ўзаемадзеяння з мовамі народаў-суседзяў, сувязі пісьменніка з роднай зямлёй, уплыву мовы на ўспрыманне чалавекам свету. Адметнай рысай барадулінскага асэнсавання мовы з’яўляецца шырокае выкарыстанне асацыятыўнага плана, гумару, перыфраз, яркіх параўнанняў і метафар.

Літаратура

1. Барадулін, Р. Выбраныя творы: у 2 т. – Мінск : Маст. літ., 1984. – Т. 1: вершы / Р. Барадулін. – 415 с.
2. Барадулін, Р. Збор твораў: у 4 т. / Р. Барадулін. – Мінск : Маст. літ., 1996–2002. – Т. 2. – 1998. – 382 с.
3. Барадулін, Р. Збор твораў: у 4 т. / Р. Барадулін. – Мінск : Маст. літ., 1996–2002. – Т. 1. – 1996. – 382 с.

V. Yu. Barouka
Vitebsk State University named after P. M. Masherov
e-mail: klit@vsu.by

Artistic comprehension of language in the poetry of Ryhor Baradulin

Key words: poetry, language, native language, artistic comprehension, themes.

The creativity of R. Baradulin is a vivid example of both latent and direct understanding of the language. Analysis metalanguage reflections in poetry of Baradulin suggests that the literature – it is not only the art of the word, but also an important means of artistic interpretation of language in human life, the native language of history and its interaction with the languages of neighboring nations, due to the writer's native land, influence language on the human perception of the world. A characteristic feature of comprehension of the language by R. Baradulin is the widespread use of the associative plan, humor, periphrases, vivid comparisons and metaphors.

С. Ф. Бут-Гусаім
Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна
e-mail: svfbg@tut.by

УДК 808.26-541.2

Антрапанімікон рамана Вольгі Іпатавай “Альгердава дзіда”

Ключавыя словы: літаратурная анамастыка, онім, антрапонім, паэтонім, ускоснагаваркі паэтонім.

У артыкуле разглядаюцца ўжытыя ў рамане Вольгі Іпатавай антрапонімы, якія з'яўляюцца носьбітамі каштоўнай інфармацыі аб матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў XIII–XIV стагоддзяў. У працы прааналізавана ўзаемадзеянне ў беларускім антрапаніміконе гэтага гістарычнага перыяду язычніцкага і хрысціянскага кампанентаў. Разгледжана характэрная для міфалагічнай свядомасці крэатыўная функцыя наймення. Імёны персанажаў былі прааналізаваны з пункту гледжання ступені іх сэнсавай актыўнасці.

Адметнасцю мастацкага асэнсавання даўніны ў творах В. Іпатавай з’яўляецца ўзнаўленне не столькі самой гісторыі, колькі «чалавека ў віхурах яе, у паўсядзённых сутыкненнях з праблемамі свайго часу» [8, 98]. Творы пісьменніцы характарызуюцца як дэталёвай перадачай гістарычных рэалій, так і мастацкім спасціжэннем светаўспрымання людзей пэўнай эпохі. Ажыўляючы далёкія постаці XIV стагоддзя, часу княжання Альгерда, пісьменніца ўмела выкарыстоўвае вобразна-выяўленчыя магчымасці антрапанімічнай лексікі, якая з’яўляецца носьбітам каштоўнай нацыянальна-гістарычнай інфармацыі аб матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў.

Раман В. Іпатавай цікавы і адметны спалучэннем свету рэальных падзей і постацяў беларускай гісторыі са светам падзей і персанажаў, народжаных уяўленнем